На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 159 (281)
Чацвер, 11 верасня 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	6.23	19.29
Магілёў	6.24	19.27
Гомель	6.22	19.23
Мінск	6.34	19.38
Гродна	6.50	19.53
Брэст	6.52	19.52

Поўня 16 верасня.

Поздравляем, ребята!

В сентябре нынешнего года Гвардейский 355-й Барвинковский ордена Кутузова II степени танковый полк отметит свое 55-летие.

На снимке. *Экипаж танка Т-72: механик-водитель рядовой Александр Авсеенко, командир танка младший сержант Анатолий Яскевич, наводчик орудия рядовой Дмитрий Кочетков.*

Фото Николая ПЕТРОВА, БелТА.

Закулисье

Через Вильнюс вломившись в Европу "на равных", официальный Минск немедля нахамил господину Ари Косто

В начале августа 1997 года президент республики Александр Лукашенко и специальный представитель Европейского Союза в Беларуси Ари Косто договорились о продолжении трехсторонних переговоров между депутатами Верховного Совета 13-го созыва, исполнительной властью и посреднической миссией во главе с Мэтью Расселом. Очередной раунд диалога рабочей группы должен был начаться 9 сентября.

До назначенной даты официальный Минск, по его понятиям, практически получил допуск в европейское сообщество, побывав на вильнюсском саммите. Участие в конференции глав 11 стран и было расценено как признание Беларуси равной среди равных. Заполучив аванс респектабельности, республика в лице своих первых лиц повела себя с типичным для них несравненным иезуитством и коварством.

8 сентября министр иностранных дел Иван Антонович и президент Александр Лукашенко имели приватную беседу. Во второй половине дня на пресс-конференции Иван Иванович безапелляционно заявил, что намечавшиеся на завтра трехсторонние переговоры не состоятся. Понятно, что такого рода решение руководитель внешнеполитического ведомства не мог принять сам по себе. Он лишь обстряпал его процессуально: сказал, что обратился с петицией к сменившемуся председателю Евросоюза с изложением позиции президентской стороны в переговорном процессе и не получил ответа, в связи с чем диалог откладывается на неопределенное время.

В означенный день в Минск, естественно, не прибыл Мэтью Рассел и другие члены европейской стороны рабочей группы. По дипломатическим каналам в Беларусь поступила информация о том, как оценили ситуацию арбитры: официальный Минск опять сорвал переговоры. Президентская сторона, практически не заботясь о политесе, грубо нарушила обещания, данные главой государства господину Ари Косто, — по-шкловски нахамила авторитетному дипломату и крупному общественному деятелю.

Людмила ВАЛЕНТИНОВА.

Провинциалка

Срок для ушлого "вертикальщика"

Десять месяцев длился процесс по делу бывшего председателя Лунинецкого горисполкома Константина Негрея, обвинявшегося во взяточничестве, превышении власти и составлении заведомо ложных документов. Жулик-мэр долгое время находился в бегах, пока не был пойман и привезен из России в наручниках. И вот наконец финал — приговор в восемь лет лишения свободы.

"Картошка" как студенческая неизбежность и председательская реальность

Лишь Ивацевичский район на Брестчине отказался от использования учащейся молодежи на осенних уборочных работах — при сопоставлении пользы от студенческого труда и неизбежно возникающих при этом проблем здесь решили поднатужиться и справиться своими силами. Все же остальные районы высказались однозначно: во имя спасения урожая студентов от учебы оторвать! Согласно поданным в облисполком заявкам, колхозам и совхозам требуется 4615 человек. Хозяйства уже заключили с учебными заведениями соответствующие договора.

... Да несчастье помогло

У работников и юных спортсменов брестской ДЮСШ-6 большая радость. В счет погашения долгов перед госбюджетом ОАО "Ковры Бреста" изготовило для спортшколы уникальный гимнастический ковер, равного которому, говорят, нет в республике. Размер ковра — 11,5 на 14,5 метра, а качество соответствует высоким стандартам международных соревнований.

Уж Брест разгуляется!

Едва Брестский ликеро-водочный завод поставил на поток нежнейший по вкусу ликер "Персик", как в его фирменном магазине покупателям снова довелось разинуть рты. На полках под ценником 373 тысячи 200 рублей выставили невиданную трехлитровую бутыль с водкой "Люкс". Столь необычная тара приобретена в Польше, и разливать в нее планируется также водки "Беловежская" и "Беларусь".

Может, теперь милиция станет ловить убийц?

В УВД Брестского облисполкома запущена в работу уникальная компьютерная система "Алеся-КОРЗ". Благодаря этой системе дежурный офицер на пульте будет в любой момент знать точное месторасположение всех патрульных машин и сможет при каждом серьезном преступлении выбирать оптимальный и наиболее короткий маршрут для ближайшей к месту происшествия дежурной группы. Работать с новинкой, каких еще нет ни в одной из стран СНГ, будет специально созданная "под систему" городская дежурная часть.

Жертвы пикника

Беда настигла четырех жителей деревни Маньковичи Столинского района и находившуюся с ними девушку из райцентра, как всегда, внезапно. Все было красиво и весело, компания возвращалась с пикника, где наравне со всеми отдыхал и владелец "Фольксвагена", взявшийся всех развозить. На крутом берегу Горыни ему предстоял разворот, с которым автомобилист не справился. Автомобиль упал в реку — на беду, в глубоком месте. Из пятерых выбраться из пучины смогли лишь двое — мужчина и девушка. Тела остальных на следующий день поднимали вместе с автомобилем.

Подготовила Анна ШАХОВА.

По существу

Реквием по миллиону...

Завершающаяся уборка зерновых подтвердила две вещи, которые "Народная воля" недавно предсказывала.

Во-первых, урожай оказался выше, чем в прошлом году. Что, впрочем, неудивительно. Поскольку прошлый год был засушливым. И сравнивать с ним означает примерно то же самое, что сравнивать сексуальные возможности робкого пушистого цыплёнка и горластого хозяина гарема — задиристого петуха!

Не будем называть цифры — они ещё не выяснены окончательно, но счёт явно в пользу петуха.

По всему подтверждается и второе предсказание "Народной воли": *Увеличение урожая на пользу республике не пошло. Потому что в поле осталось даже больше миллиона тонн зерна — пятая, примерно, часть. Где-то неубранная, а где-то потерянная из-за плохого качества техники, которая вот уже много лет не обновлялась.*

Нельзя не отметить: в то, что на полях все же осталось немало хлеба, свой достойный вклад внесли практически все государственные структуры Республики Беларусь. Начиная от президента, по чьей инициативе уже не первый год держатся губительные для производителя закупочные цены, в результате чего молоко и мясо убыточны, а значит, обновлять технику не за что.

Кстати, в правительстве республики, по данным из достоверных источников, лежит бумага, где говорится буквально следующее: если цены на продукцию сельского хозяйства Беларуси довести до уровня цен в соседнем Смоленске, то это даст дополнительно селу около 30 триллионов "зайцев".

Хочу напомнить, что сумма тех подачек, которые с большой помпой получает село к севу, уборке и пр., в этом году составила только 6 триллионов! То есть ситуация, как в вековечной истории с бестолковым, но жадным хозяином, который стрижёт своего барана и за проданную шерсть живёт припеваючи. Правда, барана кормит плохо. По той только причине, что знает: баран, он и в Турции баран! Всегда будет позволять себя стричь и жить впроголодь!

Плохо накормленный баран однажды издохнет. Но и это никого особенно не волнует. Хозяина потому, что он, как мы уже отмечали, недальновидный и жадный и считает, что ситуацию можно напрягать до бесконечности. А барана... потому что он баран!

...Немалую долю в то, чтобы оставить зерно на полях, внёс и такой авторитетный орган, как Совет безопасности. Уже отработанные документы на поставку в Беларусь производительных немецких зерноуборочных камбайнов люди Виктора Шеймана (большого, как известно, специалиста по сельхозтехнике!) так "запроверяли", что с реализацией своего же кредита и поставками немцы могли бы успеть к уборке при одном условии: только если бы ввели на своих железных дорогах чрезвычайное положение. А такое там, как и полагается в нормальном государстве, делается только в случае объявления войны или природной стихии...

...Словом, к уменьшению урожая приложили руки все государственные органы, вольно или невольно консервирующие сегодняшнее положение сельского хозяйства. И можно назвать только одну попытку уменьшить эти потери, кстати, от года к году растущие. Это попытка Минсельхозпрода совместно с промышленниками построить собственный зерноуборочный комбайн.

Сама по себе идея создать эту весьма сложную машину, не имея соответствующей конструкторской и технологической базы, выглядит весьма проблематичной. Мы уже имеем "Гомсельмаш", который за много лет так и не сделал ничего даже приближающегося по качеству хотя бы к комбайнам семейства "Е" из бывшей ГДР, которые, в свою очередь, на уровень ниже своих собратьев из ФРГ и остального рыночного мира.

К тому же машина предполагается в виде компота из небольшой части абрикосов, а в остальном — из яблок антоновки. То есть самые сложные части будут немецкими — выполненными из более качественного металла и по более совершенным технологиям. Остальные наши — из нашего металла и по нашим технологиям.

Не поглотит ли резкая кислота антоновки приятный аромат абрикоса? Авторы идеи уверены, что нет. Это понятно — они хотят как лучше. А где гарантии, что не получится как всегда?

Но ладно, пусть всё будет так, как задумано. Мы, естественно, желаем только этого. И заводы насобирают неплохие по качеству и производительности комбайны. А дальше?

Позвольте напомнить, читатель, что у нас есть весьма производительный тракторный завод. А колхозы купить эти тракторы не могут — нет денег!

При сохранении существующей экономической политики можно уверенно сказать, что затраты на создание комбайна, которые тяжёлым бременем лягут на нашу вялодышащую экономику, будут напрасными.

Алесь БУСЛАЕВ.

Дзякуй!

Тры працэнты. Здаецца, гэта няшмат, але... "Славянка" знайшла сваіх пакупнікоў

Кожны гандляр шукае свайго пакупніка. І знаходзіць яго. Прэстыжны ў Мінску "Прэстан" — новых беларусаў, звычайныя гастраномы — самых звычайных людзей з іх невялічкім заробкам. Але ёсць у сталіцы і магазіны, у якіх малазабяспечаныя людзі змогуць купіць прадукты харчавання адпаведна свайму худзенькаму кашальку. Адзін з такіх — універсам "Славянка" сумеснага прадпрыемства "Іннабел", што знаходзіцца на вуліцы Лынькова. У ім кошт тавараў ніжэйшы, чым у звычайных мінскіх гастраномах, — гандлёвая нацэнка на большасць тавараў складае толькі 7%. Але і не толькі таму. Амаль усе тавары тут айчыннай вытворчасці і пастаўляюцца з раёнаў, таму яны і больш танныя. А для пенсіянераў, інвалідаў усіх груп, маці-гераінь, ліквідатараў ЧАЭС і іншых ільготнікаў існуе спецыяльная каса з трохпрацэнтнай скідкай. Здаецца, гэта няшмат. Але з гэтых трох працэнтаў у год пенсіянер можа зэканоміць прыблізна дзве пенсіі.

Калі ў снежні мінулага года ўпершыню адчыніліся дзверы універсама, недаверлівыя бабулькі ніяк не маглі паверыць у тое, што сапраўды кожны прадукт можна купляць за меншы кошт. Але так і было на самой справе — на кожны батон ці пакет малака давалася скідка. А калі колькасць пакупнікоў станавілася больш за адну, дзве, тры тысячы і гэтак далей, то ў той дзень у магазіне знаходзілі адну з самых бедных бабулек і дарылі ёй "карзіну пакупніка". Прадаўцы "Славянкі" расказвалі аб тым, як гэта адбывалася. Бабулькі ніяк не маглі паверыць, што яны ў гэтым жыцці нешта атрымалі задарма, плакалі, ледзь не рукі цалавалі. Але ў магазіне лічаць, што ўсё гэта не падстава для гонару. Гэта наш агульны боль, што большасць беларускіх пенсіянераў жывуць у галечы. І па магчымасці кожны павінен хоць чым-небудзь дапамагчы ім.

"Іннабел" ужо мае пэўны вопыт у арганізацыі такога роду дзейнасці. Каля года існаваў магазін са скідкамі для малазабяспечаных людзей на "Гарызонце". У ім таксама рабочыя гэтага прадпрыемства маглі купіць прадукты харчавання па крэдытных картках на дзве трэці свайго заробку. Не кожны месяц яны атрымлівалі на "Гарызонце" астатнюю, трэцюю, частку заробку, але кожны месяц мелі магчымасць узяць у гэтым магазіне ўсе неабходныя прадукты для сваёй сям'і. На жаль, з-за фінансавых цяжкасцей "Гарызонта" гэты магазін не змог доўга працаваць. А зараз кіраўніцтва "Іннабела" вядзе перагаворы з МАЗам, трактарным заводам, "Мілавіцай" аб стварэнні на іх тэрыторыі такога роду магазінаў. У іх работнікі прадпрыемстваў змогуць па крэдытных картках за мінімальны кошт набываць самыя неабходныя тавары. Трэба сказаць, што такія магазіны распаўсюджаны ва ўсім свеце. У Германіі гэта сістэма магазінаў "Альдзі". Дарэчы, іх вопыт і вывучалі супрацоўнікі "Іннабела".

Ва універсаме "Славянка" сёння пятую частку ад агульнага аб'ёму прадукцыі складаюць тавары, што прадаюцца з 3%-най скідкай. А з 15 верасня яна будзе павялічана да пяці працэнтаў. Спадзяюся, што гэта стане добрай падтрымкай для многіх малазабяспечаных жыхароў Мінска.

Ганна СОУСЬ.

Пратэст

На МАЗе пагражаюць усеагульнай забастоўкай...

Днямі Свабодны прафсаюз Мінскага аўтамабільнага завода распачаў збор подпісаў сярод працаўнікоў завода за павелічэнне з верасня заработнай платы.

Напярэдадні Свабодны прафсаюз распаўсюдзіў інфармацыю наконт узроўню зарплаты на прадпрыемстве і абвясціў генеральнага дырэктара прадпрыемства В.Гурыновіча аб правядзенні вышэйузгаданай акцыі. Але, як стала вядома, замест канструктыўнага дыялогу адміністрацыя МАЗа распачала кампанію дыскрэдытацыі Свабоднага прафсаюза. Фінансавы дырэктар прадпрыемства А.Тутубалін, выступаючы па завадскому радыё, абвінаваціў прафсаюз у жаданні праз збор подпісаў узняць свой рэйтынг сярод працоўных калектываў завода. Шчыра кажучы, яго заява пра тое, што з-за акцыі працоўным зарплату ў верасні не павялічаць, выклікала ўсеагульнае здзіўленне.

Дарэчы, у эфіры на завадскім радыё прафсаюзу адмоўлена "з-за немэтазгоднасці".

У выпадку далейшага ігнаравання з боку адміністрацыі прадпрыемства патрабаванняў прафсаюза, а таксама рэпрэсій у адносінах да працоўных калектываў МАЗа Свабодны прафсаюз мае намер аб'явіць на заводзе ўсеагульную забастоўку.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Позірк у заўтра

Падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве таварыстваў дружбы Беларусі і Польшчы.

З гэтай нагоды ў Мінск прыязджала прадстаўнічая дэлегацыя з Варшавы. Яе ўзначальваў генеральны сакратар таварыства "Польшча — Усход" Янус Вітак. Ва ўрачыстых абставінах дагавор змацавалі сваімі подпісамі старшыня таварыства "Беларусь — Польшча" Леанід Лойка і яго калега з Варшавы Баляслаў Хмяліньскі.

Намечаны меры па далейшаму ўмацаванню і пашырэнню кантактаў паміж навучальнымі ўстановамі, бізнесменамі, працоўнымі калектывамі абедзвюх краін. Будзе праведзена чарговая канферэнцыя даследчыкаў па "белых плямах" сумеснай гісторыі, наладжана аздараўленне дзяцей з чарнобыльскай зоны ў Польшчы.

На цырымоніі падпісання прысутнічалі і выступілі з прамовамі Янус Вітак і старшыня Беларускага таварыства дружбы і сувязі з замежнымі краінамі Арсен Ваніцкі.

Сяргей КАВАЛЬЧУК.

Печально

Милосердие и жизненный подвиг матери Терезы

Как уже сообщалось, в Калькутте на 88-м году жизни скончалась мать Тереза — основатель и бессменный руководитель Ордена Милосердия.

Прервалась жизнь выдающейся женщины, которая, по словам премьер-министра Индии И.К.Гуджрала, наряду с Махатмой Ганди олицетворяла в жестоком XX веке истинное сострадание.

Государственные похороны матери Терезы пройдут утром 13 сентября в Калькутте, сообщил ИТАР-ТАСС. Мать Тереза будет похоронена по католическому обряду на первом этаже небольшой церкви в Доме Матери, который был ее резиденцией на протяжении многих лет. Церемония похорон будет скромной и немноголюдной.

Мать Тереза недомогала уже давно. За последние два года у нее было два сердечных приступа. Новый обширный инфаркт, постигший ее на днях, оказался роковым.

Она впервые приехала в Индию в 1928 году, движимая стремлением помогать обездоленным. Калькутта стала для нее новым домом. Здесь в 1950 году она основала Орден Милосердия, отсюда пошли по всему миру волны сочувствия, сострадания и поддержки всем страждущим. Она стала первой иностранкой, получившей гражданство в независимой Индии, а потом первой индийской гражданкой, получившей Нобелевскую премию мира за свою подвижническую деятельность.

Многочисленные приюты для сирот, школы, просветительские центры, больницы для прокаженных и больных туберкулезом по всему миру — это только часть деяний матери Терезы.

К слову сказать, первое отделение Ордена на территории бывшего СССР было создано после землетрясения в Армении. Теперь на постсоветском пространстве действует восемь отделений.

Соболезнования в связи с кончиной матери Терезы идут и идут со всего мира. Ибо благим деяниям не суждено кануть в Лету...

Алексей СОЛОДОВ.

Демократия по-белорусски

"Свободу Шеремету!" — заявил перед судом Валерий Щукин вопреки сталинскому принципу: нет журналиста — нет проблемы

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли"

Последним из 15 белорусских и зарубежных журналистов, задержанных милицией за акцию солидарности с коллегой Павлом Шереметом 31 июля 1997 года, перед судом Ленинского района Минска предстал депутат Верховного Совета 13-го созыва и репортер газеты "Товарищ" Валерий Щукин. Его как бы оставили "на десерт": ему инкриминировали не только нарушение пунктов президентского декрета номер пять, но и "сопротивление законным действиям милиции" по статье 166 административного кодекса.

9 сентября дело начала рассматривать судья Татьяна Жулковская, но отложила процесс на 17-е число. Ей пришлось иметь дело с отъявленным "рецидивистом", на котором по пятому декрету уже висит 46,5 миллиона штрафа. За очередное участие в уличной акции Щукину грозит начет в размере 300 минимальных зарплат, что при повышенной "минималке" в 200 тысяч "зайчиков" может вылиться в 60 миллионов рублей штрафа. Таким образом, потенциально Валерий Алексеевич может по совокупности преодолеть рубеж в 100 миллионов.

"Подсудимый" явился на процесс в полосатой арестантской робе, демонстративно подчеркивая готовность принять и "приговор" по административному кодексу — до 15 суток ареста. Эту униформу белорусской журналистики представители прессы обновили на марше солидарности с заключенным телерепортером в день 30 августа. Путь же свой к зданию Ленинского суда Валерий Щукин на сей раз начал от редакции "Белорусской деловой газеты", коллективу которой гродненский узник ближе всего. В ходе судебного заседания репортер "Товарища" подтвердил, что скандировал на улицах Минска "Свободу Шеремету!", и готов выразить свое возмущение по факту его незаконного ареста в любой инстанции.

Между тем аккурат 9 сентября официальные газеты в репортажах с празднования 850-летия российской столицы подчеркивали, что в ходе торжеств оба президента окончательно "договорились" относительно Шеремета. В чем же заключается тот договор? Лукашенко сказал, что не существует российского журналиста Шеремета. Ельцин, стало быть, развил идею младшего брата: нет человека — нет проблемы. По всему выходит, стороны остались довольны сталинским разрешением ситуации. Во всяком случае, официальная белорусская пропаганда с глубоким удовлетворением цитировала оценку из уст президента: "И ни он (имеется в виду Ельцин. — **Л.М.**), ни я больше на эту тему не ведем разговора..."

Человек и журналист Павел Шеремет томится в застенках КГБ с 26 июля 1997 года. Он находится в заключении полтора месяца. За этот срок "главный обвинитель" республики, президентское телевидение, успело выбросить в эфир намеки на шпионаж в пользу иностранных разведок и даже на подготовку террористического акта против особы Лукашенко. Сыщется ли в нужный момент в республике аналог сталинской тройки, которая, не дрогнув, по сфальсифицированным обвинениям приговорит нашего коллегу к пожизненному заключению или даже высшей мере наказания?

На риторический вопрос пусть ищут ответ читатели, в том числе в истории. Другие журналисты, "подельники" Щукина, начали получать исполнительные листы на выплату в бюджет республики тех штрафов, которые дружно начислили им судьи Ленинского суда 1 августа, сразу на следующий день после акции солидарности 31 июля.

Погода

В четверг и пятницу сохранится облачная с прояснениями погода. 12 сентября в северных районах Беларуси небольшие дожди. Температура ночью — 6—11 градусов тепла, днем — +12 — +17, по юго-западу — до 21 градуса тепла.

Глубинка

Городок, краеведческий музей.

Фото Александра Хитрова, БелТА.

Маладая Беларусь

Ім будаваць незалежную дэмакратычную дзяржаву

На днях адбыўся першы ўстаноўчы сойм "Маладога фронту". Зараз гэта ўжо самастойная арганізацыя са сваім статутам, лідэрамі ды кірункам дзейнасці. Але трэба заначыць, што "Малады фронт" існаваў фактычна ўжо некалькі год як маладзёжная фракцыя БНФ. І суботняя падзея зусім не стала вынікам нейкага расколу. Наадварот, моладзь упэўнена, што такім чынам памнажае фронтаўскую моц.

Яны паз'язджаліся ў Мінск з розных куткоў Беларусі: Магілёва, Гродна, Гомеля, Віцебска, Брэста, Оршы, Наваполацка, Кобрына, Пружанаў, Бабруйска... Усяго было зарэгістравана 218 дэлегатаў ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў. Шчыра кажучы, чакалася трохі болей, але неспадзявана перашкодзіла падзабытая ўжо мабілізацыя студэнтаў на "бульбу". Відаць, прагрэс эканомікі "рыначнага сацыялізму" зайшоў так далёка, што без аўралаў зноў не абысціся...

Дзякуй Богу, апальных палітыкаў да прымусовых работ яшчэ не прыцягваюць. Таму сярод гасцей былі такія вядомыя асобы, як Сямён Шарэцкі, Мікола Статкевіч, Лявон Баршчэўскі, Сяргей Папкоў, Вінцук Вячорка, Вячаслаў Сіўчык, Валерый Шчукін.

Напачатку быў зачытаны прывітальны ліст Зянона Пазьняка. Старшыня БНФ шчыра вітаў удзельнікаў мерапрыемства, зычыў моладзі поспехаў і плёну.

Потым выступіў Лявон Баршчэўскі. Як вядома, ён шмат часу аддае выкладчыцкай працы ў Беларускім гуманітарным ліцэі. Над гэтай навучальнай установай сёння вісяць цёмныя хмары найперш з-за таго, што ў яго сценах шануюць родную мову, гісторыю і культуру Бацькаўшчыны. Каб бачыць у гэтым крымінал, трэба быць сапраўды манкуртам. Зрэшты, сёння мы жывём у такіх варунках, што, як зазначыў спадар Баршчэўскі, нават карыстанне беларускай мовай ужо становіцца палітыкай.

Сапраўды, адметна, што "Малады фронт" вылучае шырокую культурніцкую, асветніцкую праграму. Вынік змагання за нацыянальную ідэю вызначаецца не толькі падчас вулічных шэсцяў. Будзённая, карпатлівая праца, скіраваная на тое, каб выхаваць пакаленне свядомых, адукаваных грамадзян Беларусі, праз колькі часу павінна даць уддзячны плён. Гэтыя людзі, чый светапогляд будзе фундавацца зусім не на "Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)", які толькі і здолелі засвоіць многія з цяперашніх уладу маючых, у рэшце рэшт пабудуюць незалежную нацыянальную дзяржаву. Невыпадкова ў праграмнай заяве сойму падкрэсліваецца, што адбудова дзяржаўнасці цесна звязана з развіццём рыначнай эканомікі, дэмакратыі, інтэграцыяй краіны ў еўрапейскую супольнасць.

Сярод выступоўцаў і гасцей былі прадстаўнікі "Чырвонага жонду", а таксама дэмакратычных маладзёжных плыняў Украіны, якія напрыканцы разам з нашымі хлопцамі і дзяўчатамі дружна скандзіравалі: "Жыве Беларусь!"

Падчас сойму прагучала шмат розных меркаванняў ды парад, не абышлося і без спрэчак. Адно не выклікала сумненняў: усім дэмакратычным арганізацыям ды партыям трэба зараз згуртавацца дзеля агульнага супрацьстаяння пануючаму рэжыму. Няхай іх погляды ў чымсьці і не супадаюць, таму яны і розныя партыі, але ж у іх пераважае дэмакратычны дух, а гэта значыць, жаданне рабіць сваю краіну вольнай, шчаслівай ды незалежнай.

Зацвердзіўшы статут "Маладога фронту", дэлегаты прыступілі да выбару кіраўнікоў. Частка стаяла за тое, каб быў адзіны лідэр, іншыя прапанавалі выбраць трох сустаршынь. Гэта значыць, трох абсалютна роўных па правах і абавязках кіраўнікоў — ад Мінску, Гродна і Магілёва, дзе існуюць самыя моцныя маладзёжныя структуры. У выніку быў прыняты кампрамісны варыянт: часова абралі трох сустаршынь, не выключаючы ў перспектыве варыянта з адзіным лідэрам. Такім чынам, зараз на чале "Маладога фронту" стаяць Павел Севярынец (Мінск), Сяргей Паўленка (Гродна) і Алесь Асіпцоў (Магілёў). Дарэчы, Павел Севярынец да ўстаноўчага сойму з'яўляўся старшынёй маладзёжнай плыні БНФ.

Вядома, хто-ніхто можа расцаніць вылучэнне "Маладога фронту" ў асобную арганізацыю як своеасаблівую альтэрнатыву стварэнню афіцыёзнага Беларускага патрыятычнага саюза моладзі. Момант спаборніцтва тут, безумоўна, ёсць. Але ўвогуле суботняя падзея выходзіць за рамкі такой прымітыўнай схемы. Бо задачы "Маладога фронту" значна больш шырокія і перспектыўныя. І калі афіцыйныя ўлады спрабуюць закаваць моладзь пры дапамозе жорсткай структуры накшталт былога камсамолу, то "Малады фронт", насупраць, разнявольвае энергію тых юнакоў ды дзяўчат, што не хочуць вяртання ў таталітарнае мінулае. Увогуле ж, змаганне для іх не самамэта. Галоўнае імкненне — творча, самаадданна працаваць дзеля роквіту незалежнай Бацькаўшчыны.

Вольга КЛАСКОЎСКАЯ.

Фотафакт

В Могилеве открыт бюст народного художника Беларуси, уроженца Могилевщины Павла Васильевича Масленикова. Бронзовый портрет сделан по проекту известного белорусского скульптора Владимира Летуна.

Фото Николая ТИТОВА.

В Речице воздвигнут памятник известному земляку, выдающемуся историку Митрофану Довнар-Запольскому.

Фото Сергея ХОЛОДИЛИНА, БелТА.

Культура

Купалаўцы сабраліся, значыць, тэатр пачаў працаваць

Хоць да адкрыцця новага тэатральнага сезона ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы яшчэ час ёсць, акцёры ўжо вярнуліся ў родныя сцены.

Збор трупы ўжо прайшоў. А пачаўся ён з віншаванняў Віктару Манаеву, які нядаўна ўдастоены звання заслужанага артыста рэспублікі. Шмат прыемных слоў у свой адрас пачуў тут і Аляксандр Гарцуеў, чыя пастаноўка “Крывавай Мэры” карысталася ў мінулым сезоне такім поспехам, што яе хацелі б убачыць і за межамі краіны. Спектакль у канцы верасня будзе паказаны ў час правядзення Дзён беларускай культуры ў Малдове. У кастрычніку “Крывавую Мэры” чакаюць у Харкаве і Санкт-Пецярбургу.

Паездзіць сёлетняй восенню давядзецца і іншым артыстам тэатра. У лістападзе купалаўцы прымуць удзел у святкаванні 50-годдзя Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, а таксама 190-годдзя Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску. А ў снежні ў планах нашых акцёраў — паездка ў Львоў.

Акрамя гэтых падзей, купалаўцаў чакае атэстацыя акцёрскага складу. А пакуль пачынаюцца прывычныя будні. І ўжо з 15 верасня на галоўнай сцэне адновіцца работа над спектаклем “Князь Вітаўт”, прэм'ерным паказам якога і пачнецца новы сезон у тэатры.

Вольга ШЧАДРЫНА.

Ураджайная восень аркестра Фінберга

Адразу тры новыя канцэртныя праграмы падорыць суайчыннікам у пачатку сезона Дзяржаўны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі Міхаіла Фінберга.

У кастрычніку пад яго патранажам адбудзецца першы фестываль джазавых калектываў Беларусі. Серыю аўтарскіх вечароў прадоўжыць вечар народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Гітарыст аркестра Сяргей Анцішын запросіць паклоннікаў на свой бенефіс.

Рэпетыцыі ў родных сценах калектыў аркестра пачаў пасля непрацяглага адпачынку, адпрацаваўшы надзвычай напружана, але з вялікім задавальненнем у святочных праграмах, прысвечаных 850-годдзю Масквы. Расказваючы карэспандэнту БелТА аб незабыўным вераснёўскім тыдні ў першапрастольнай, маэстра Фінберг асабліва адзначыў, што ў канцэртнай зале “Расія” 1—2 верасня аркестр працаваў з такімі зоркамі, як Іосіф Кабзон, Лілі Іванова, Каці Ковач, Бісер Кіраў, Радміла Караклаіч і Янаш Коаш. 6 верасня аркестранты не пакідалі сваю сцэну, устаноўленую на Краснай плошчы расійскай сталіцы, з раніцы і да позняга вечара. Ва унікальным тэлемарафоне “Славянскі свет вітае Маскву” яны прадставілі сваіх салістаў, удзельнікаў конкурсу песень аб Маскве і гала-канцэрта лаўрэатаў “Славянскага базару”.

Лідзія ПЕРАСЫПКІНА, БелТА.

Памяць

...І ніхто не забыты

Капсулы з зямлёй, сабранай на асноўных нарвежскіх могілках, дзе пахаваны савецкія салдаты, закладзены ў фундамент ваенна-ландшафтнага мемарыяла “20-ае стагоддзе — загінуўшым салдатам”. Яго адкрыццё пад Стоўбцамі намечана на лета 1999 года.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-службе Міністэрства абароны, ініцыятарам стварэння мемарыяла выступілі грамадскае культурна-асветніцкае аб'яднанне “Садружнасць”, а таксама шэраг грамадскіх арганізацый і дзеячаў з многіх еўрапейскіх дзяржаў. Ён будзе створаны ў гонар 6,5 мільёна расійскіх і савецкіх салдат, якія загінулі ў Еўропе ў часы першай і другой сусветных войнаў. Мяркуецца, што на 15 гектарах мемарыяльнага комплексу будзе разбіты парк, пабудавана некалькі мемарыяльных груп, пантэон і капліца.

У Нарвегіі на 63 могілках пахаваны 12781 савецкі салдат. 10 верасня на месцы стварэння мемарыяла вядомы нарвежскі журналіст Пер Йеўне перадасць беларусам урны з зямлёй, узятай на могілках, пасля чаго адбудзецца іх пахаванне. У далейшым пад Стоўбцамі плануецца правесці пахаванне урнаў, дастаўленых з іншых еўрапейскіх краін.

БелТА.

Інвестыцыі

Для крэдытаў не хапае добрых бізнес-планаў

У мінулым годзе і сёлета ў аграпрамысловым комплексе рэспублікі рэалізавана чатыры інвестыцыйныя праекты. Іх агульны кошт склаў 1570 тысяч долараў ЗША і 7,2 мільёна нямецкіх марак. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання краіны.

Сярод тых, хто атрымаў замежныя крэдыты, — віцебскі кандытарскі камбінат “Віцьба”, Ляхавіцкі завод металапластмасавых вырабаў, Гомельскае аб'яднанне мяса-малочнай прамысловасці, а таксама гаспадаркі, якія спецыялізуюцца на вырошчванні буракоў і ўваходзяць у зоны цукровых заводаў.

Невысокая колькасць прадпрыемстваў, якія выкарыстоўваюць для павышэння эфектыўнасці сваёй работы замежны капітал, выклікае занепакоенасць у спецыялістаў галіновага міністэрства. На іх думку, яна абумоўлена нізкай актыўнасцю гаспадарак у падрыхтоўцы бізнес-планаў. Перш за ўсё, паводле слоў спецыялістаў, у калгасах, саўгасах і іншых прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу не хапае штатных супрацоўнікаў з вопытам іх складання пад такія праекты. Займаюцца гэтым пераважна бухгалтары ў вольны ад выканання асноўных абавязкаў час. Вынікі такой работы, як правіла, не задавальняюць патэнцыяльных крэдытораў.

Як адзначылі ва ўпраўленні замежных інвестыцый Мінсельгасхарча, важнасць прыцягнення замежнага капіталу ў сельскую гаспадарку абумоўлена перш за ўсё неабходнасцю ўкаранення новых тэхналогій у аграрную вытворчасць. Урад Беларусі надае гэтаму фактару асаблівае значэнне. У рэспубліцы адкрыта некалькі міжурадавых крэдытных ліній, аднак кіраўнікі гаспадарак і прадпрыемстваў не праяўляюць належнай ініцыятывы па іх выкарыстанню.

Дзмітрый ФЁДАРАЎ.

“Тэрмапласт” эканоміць нашы грошы

Вытворчае аб'яднанне “Тэрмапласт” асвоіла выпуск звышэканамічных прамысловых свяцільняў. Новы асвятляльны прыбор па магутнасці адпавядае прывычнай 75-ватнай лямпачцы напальвання, але электраэнергіі спажывае амаль у сем разоў менш. Цяпер выпускаюцца дзве базавыя мадэлі, якія прымяняюцца для асвятлення вытворчых памяшканняў, а таксама пад'ездаў і іншых нежылых памяшканняў у шматкватэрных дамах.

Зрэшты, як паведамілі карэспандэнту БелТА на “Тэрмапласце”, магчымасцей для асваення перспектыўнай прадукцыі ў прадпрыемства застаецца ўсё менш. Асноўныя тэхналагічныя лініі не абнаўляліся больш як 5 гадоў.

Уладзіслаў ПЛАТУН.

Будуйся!

У моладзі Віцебшчыны — наваселлі

Першыя кватэры, пабудаваныя для моладзі, заселены ў Віцебскай вобласці.

— У верасні колькасць такіх навасёлаў дасягне 261, — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам БелТА намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалай Пашэнька. — У Віцебску і іншых гарадах вобласці шмат тых, хто жадае выкарыстаць ільготныя крэдыты, прадугледжаныя ўказам прэзідэнта. Але выдзеленых на гэтыя мэты сум пакуль не хапае. У сельскай мясцовасці маладыя сем'і не такія актыўныя. Але прыярытэты ў вобласці аддадзены менавіта забудоўшчыкам на вёсцы, бо сельская гаспадарка адчувае недахоп маладых рук.

Усяго ж 1288 маладых сем'яў стварылі ў вобласці 27 жыллёва-будаўнічых кааператываў, 879 вырашылі пабудаваць індывідуальныя дамы, у спісе на куплю жылля з дапамогай субсідый — яшчэ 73 прэтэндэнты. Дзяржава выдзеліла крэдыты на суму больш як 100 мільярдаў рублёў толькі для Віцебскай вобласці.

Вольга СІДАРОВІЧ.

Віцебск.

Афіцыйна

Нас абароніць закон!

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях распрацаваны праект закона Рэспублікі Беларусь “Аб прамысловай бяспецы”. Ён прайшоў ужо ўзгадненне ў Міністэрстве эканомікі краіны і будзе прадстаўлены ва ўрад для далейшага разгляду і ўдакладнення.

Як растлумачылі карэспандэнту БелТА спецыялісты Мінэканомікі, дакумент накіраваны на абарону людзей, грамадства, прыроднага асяроддзя, матэрыяльных і культурных каштоўнасцей ад пагрозы ўзнікнення прамысловых аварый.

Праектам закона вызначаюцца небяспечныя аб'екты, умовы, прад'яўленыя да іх, неабходнасць расследавання аварыйных выпадкаў, што адбыліся на вытворчасці. Акрамя таго, у дакуменце агаворваюцца неабходнасць захавання патрабаванняў бяспекі пры праектаванні, размяшчэнні, будаўніцтве прамысловых аб'ектаў і дзяржаўны кантроль за імі.

БелТА.

Ситуация

Пользуйтесь, детки, или Как акт милосердия превратился в беду

После почти четырехмесячного хождения по всевозможным инстанциям Елена Борженко, председатель районной организации “Чернобыль-помощь”, сможет, наконец, перевести дух.

Началась вся эта история еще в первых числах мая нынешнего года. Известный в Беларуси человек, представитель немецкой благотворительной организации “TRANSHELP” Петер Линферт привез в Витебск довольно значительный груз гуманитарной помощи. Могли ли сердобольные немцы, собравшие для наших детей одежду, обувь, лекарства, медицинское оборудование, предположить, что их пожертвования не скоро доберутся до адресата?

Расписавшись в необходимых документах и перегрузив вещи в таможенный склад, Елена Борженко принялась растаможивать груз.

Другими словами, изо дня в день, неделю за неделей ходить из кабинета в кабинет, постоянно натыкаясь на равнодушные взгляды чиновников. За эти четыре месяца педагогу Елене Борженко пришлось изучить все тонкости бюрократической казуистики, потратив на это большую часть своего отпуска и не поддающееся измерению количество нервных клеток. То чиновник забыл в резолюции одно слово написать, то начальник подписать не может, то нужный бюрократ вообще отсутствует...

А тем временем коллеги Елены по школе начали уже проявлять недовольство — общественная работа, дескать, тоже важна, но пора бы и честь знать! С другой стороны — больные ребятишки, уже видевшие груз, нетерпеливо спрашивали каждый раз: “Когда же, когда? Обещали же!”

Разумеется, вещи, пролежавшие четыре месяца на складе, стали выглядеть несколько иначе, чем весной. По мнению Елены Борженко, сироты и инвалиды, скорее всего, получат кучу заплесневелого тряпья. Не говоря уже о том, что самих вещей за время пребывания на складе на вид значительно поуменьшилось. Что это — усушка, утряска?

Вместе с одеждой, обувью, медоборудованием в составе гуманитарного груза был еще и ящик с медикаментами в адрес Новковской средней школы. Несмотря на крайний дефицит лекарств, получить дети ничего не смогут. Вся беда в том, что при формировании груза помощи немцы не догадались на каждую упаковку таблеток, на каждый бинт представить сертификат качества. Откуда знать немцу, что по белорусским законам принадлежность препарата к фирме, скажем, Вауер, не играет никакой роли. В итоге ящик с лекарствами, срок годности которых истечет лишь в будущем веке, по нашим гуманным законам предписано... сжечь. Или отправить назад, в Германию. И все-таки сотрудники витебской организации “Чернобыль-помощь” считают, что им повезло — хоть что-то смогли передать крайне нуждающимся детям. И не без страха думают о том, что добросердечные немцы могут повторить акт милосердия.

Открытое письмо

Почему животные умирают в страшных муках, от голода и жажды?

Председателю Минского горисполкома В.В.Ермошину

Члены общества защиты животных “Каштанка”, выражая мнение многочисленных жителей города Минска, обращаются к Вам с надеждой быть услышанными.

Несмотря на то, что наш город неузнаваемо изменился и похорошел, в Минске “царит” настоящий вандализм по отношению к животным.

Сообщения из разных районов города буквально вопиют о беспределе, который проводят “бригады смерти”, разъезжающие по городу. С особой жестокостью отлавливают животных, причем часто домашних. Их хозяева звонят нам, умоляют помочь их найти. Особо смелые добираются до того места на Раковском шоссе, куда отвозят несчастных животных и где они умирают в страшных муках, от голода и жажды.

В своем выступлении на Дне города Вы говорили о том, что Минск вступает в новое тысячелетие цивилизованным городом. Но вряд ли это возможно при подобном варварском отношении к животным.

Необходима коренная перестройка ветеринарной и санитарной службы города, а также доступность средств массовой информации для воспитания общественности в духе гуманного отношения к животным. В отличие от белорусских, в российских СМИ имеются десятки тематических передач о животных. У нас же не только таких передач нет вообще, но и любая попытка пробиться в СМИ дается с трудом.

Мы убеждены: при подобном отношении к “братьям нашим меньшим” никогда наш город не станет цивилизованным.

Мы просим принять нас лично, а также пригласить всех заинтересованных лиц, представителей санитарной, ветеринарной службы, а также жилищно-коммунального хозяйства, чтобы выработать план совместных действий по спасению животных. И своих душ — тоже.

Члены общества защиты животных “Каштанка”: Бычкова, Голод, Ивакина, Серебрякова, Рубинчик, Тиманюк и другие.

Закон Божий — в школу?

Более 600 жителей Миорского района поставили свои подписи под обращением местного общества “Православная инициатива” к властям республики о введении в национальную программу среднего образования курса “Закона Божьего”. Посильный вклад готовы внести и церкви района, собравшие от прихожан для создания учебного пособия почти 5 миллионов рублей.

Евгений ТОМОВ.

Роздум

Васіль ГРОДНІКАЎ, журналіст

Менталітэт

або Чаму браткі-беларусы

Як сябе памятаю (а мне ўжо нямала год), у нас заўсёды любілі параўноўваць наша жыццё то з 1913 годам, то з 1940-ым, а зараз, калі стала некаторым выгадна, то і з застойнымі часамі. І зрэдку хто спрабуе зазірнуць у будучае наша жыццё.

Ну, напрыклад, калі б у нас пайшлі як след разумныя рэформы, калі б тыя, хто зверху, накіроўвалі нас дальнабачна і не ленаваліся думаць менавіта галавой, то праз 10—15 гадоў мая і ваша пенсіі дасягнулі б тысячы і больш долараў, зарплата кваліфікаваных рабочых і калгаснікаў — 2—2,5 тысячы, прафесара — 5—6 тысяч, дапамога беспрацоўнаму, скажам, была б 500 долараў у месяц.

А калі наш “рынкавы сацыялізм” і надалей будзе будавацца гэтак жа “паспяхова” (пра што так настойліва ўбіваюць нам у галовы прэзідэнцкія прапагандысты), то ў недалёкім будучым (праз 5—7 гадоў) заўчасна памру я і ўсе цяперашнія пенсіянеры і блізкія да нас па ўзросту, палова маладых людзей будуць нагадваць удзельнікаў “сухой” галадоўкі, астатняя палавіна — разбойнікаў з вялікай дарогі. Дзеці, у большасці сваёй, будуць з'яўляцца на свет рахітамі. Жанчыны будуць няздольныя нараджаць здаровых дзяцей. Згінуць калгасы і саўгасы, завянуць на каранi парасткі фермерства, парастуць быллём тэрыторыі фабрык і заводаў і месцы, дзе калісь стаялі “камкі”, апусцеюць школы і ВНУ, патухнуць ачагі культуры і навукі, знікнуць нават карткі на прадукты, бо прадуктаў хопіць толькі на шматлікія армію, прэзідэнцкую ахову, АМАП і на некаторыя прыбліжаныя да вярхушкі арганізацыі і ўстановы.

Затое будзе працаваць беларускае радыё на ўсіх хвалях, на ўсіх каналах будзе ісці толькі БТ, будуць выходзіць вялізнымі тыражамі дзяржаўныя газеты, усхваляючы прэзідэнта і яго наймудрэйшую палітыку эканамічнага і сацыяльнага ўздыму жыцця беларускага народа. Будуць статкамі хадзіць па вуліцах гарадоў і вёсак амапаўцы і галаварэзы з лукамола “Прамое дзеянне”, выбіраючы сабе жывыя аб'екты для “перавыхаваўчай” работы пры дапамозе “дэмакратызатараў”. Ну, прыкладна гэтак, як у Вайновіча...

А тыя, хто застанецца жыць, будуць хваліць вялікага “бацькуінтэгратара” за тое, што яшчэ жывуць, нешта такое ядуць, спрабуюць працаваць, хоць і не выдаюць зарплаты.

У сувязі з гэтым успомніўся мне адзін факт, які, я думаю, навядзе вас на адпаведны роздум.

Было гэта тады, калі наша славутая каўбаса каштавала два рублі. Стаяў я ў доўгай чарзе за гэтым крухмальна-мясным субпрадуктам. Стаяць трэба было доўга, а таму, каб збавіць час, разгаварыўся з адным дзедам, які заняў за мной чаргу.

— Як жыццё, дзядуля? — запытаўся я.

— А дзякуй Богу, ёсць хлеб і да хлеба...

Апасля мне падумалася: а калі б была магчымасць спытаць такога ж дзеда, скажам, у шаснаццатым стагоддзі, што б той адказаў? Адназначна, адказаў бы гэтак жа. А мінула з тае пары аж чатыры стагоддзі!

І для параўнання: хто будзе з вас у ЗША, Германіі, Швецыі ці ў якіх-небудзь Нідэрландах, спытайце, калі ласка, у такога ж дзеда пра яго жыццё-быццё. Ці пачуеце вы адказ, аналагічны беларускаму варыянту? Ніколі!

Мы гадоў сорак запар спрабуем вырашыць “продовольственную программу”, каб накарміць свой народ. Нягледзячы на шматлікія патугі, да сённяшняга дня ніякіх зрухаў. Не дапамагаюць ні селектарныя шоу-нарады, ні верталётныя страх-рэйды, ні пагрозы-абяцанкі. Вось сапраўды невырашальная праблема! А не ў Сахары ці Эфіопіі жывём. На добрай урадлівай зямлі, дзе жывуць руплівыя і працавітыя людзі, асабліва на вёсцы.

Жыву на вёсцы і я вось ужо сёмы год. Маю такую-сякую гаспадарку на 25 сотках. Пасадзіў малады садок, ягаднікі. Астатняя зямля — пад бульбу, буракі, сенакос і выпас для коз і маладняку. Ёсць з дзесятак курэй, гадаваў парсюкоў такіх, што аж суседзі зайздросцілі. Ну, канешне, ёсць сабака і кот. Адным словам, жыву, як і большасць маіх аднавяскоўцаў. І, як той дзед казаў, ёсць хлеб і да хлеба, ёсць пакуль што чым прыняць гасцей, ёсць што даць і на дарогу.

Кожны дзень сустракаюся з вяскоўцамі, гамонім пра жыццё-быццё. Што хвалім, што клянём, а пра што і спрачаемся. І спрачаемся не таму, што, скажам, куры залезлі ў суседскі агарод, карова або каза патравы нарабіла ці за суседскія межы. Спрачаемся... на палітычныя тэмы. Сёння гэтыя спрэчкі не раўня іншым бытавым. Тут, бывае, кулакі ідуць у ход, сукравіцай мыюцца. А ўсё ад таго, што адны (іх большасць) дужа любяць Лукашэнку, а другія — на дух яго не пераносяць. Адны здымаюць іконы і вешаюць замест іх партрэт “бацькі”, другія — карыкатуры на яго. Адны не адрываюцца ад рэпрадуктараў і экранаў БТ, амаль штодзённа слухаючы выступленні прэзідэнта, а другія купляюць тэлеантэны з узмацняльнікамі і глядзяць незалежныя тэлеканалы, як у сталінскія часы, шукаюць на кароткіх хвалях, на старонках нелюбімых “бацькам” газет жаданае слова праўды. Першых агортвае, як калісьці, страх перад начальствам, другія першых называюць мышамі, што хаваюцца пад венікам.

Адна мая суседка неяк папрасіла ў мяне пачытаць газеты, што я выпісваю, дык, як прызналася яна потым паштальёнцы, да ранку не магла заснуць: усё чакала, што вось-вось пастукае ў дзверы ўчастковы і адправіць яе за гэта туды, куды Макар цялят не ганяў.

Так, тут, у вёсцы, у прэзідэнта ёсць моцная падпорка. Так званы сельскі электарат, на які робіць стаўку “бацька”, тут настолькі загіпназаваны, замбіраваны і запалоханы афіцыйнай прапагандай, што часам самыя пераканаўчыя і неабвержныя факты пра гібельнасць афіцыйнага курсу ўлад не выклікаюць у большасці сялян ніякіх супраціўных думак. Здаецца, што ўсе яны хварэюць на палітычны СНІД.

Хоць і жыву я сярод гэтых людзей і лічаць яны мяне ўжо за свайго, вясковага мужыка, але не да канца магу зразумець: як уладкаваны мазгі ў некаторых сялян, што яны ніяк не могуць спасцігнуць сваю ж спрадвечна мужыцкую ісціну: людзей слухай, а галаву сваю май. Ну, кожнаму слову, сказанаму па радыё ці тэлебачанні, надрукаванаму ў дзяржаўных газетах, вераць, як малое дзіця ў казку. Богу не вераць так, як вераць у салодкую хлусню афіцыйных СМІ. Ледзь што скажаш не так, як прынята цяпер гаварыць на вуліцы пра ўладу, у адказ пачуеш “неабвержны” доказ:

— Дык во і па радыё гаварылі, і ў газетах пісалі...

Або:

— Дык учора сам Лукашэнка пра гэта казаў...

Напярэдадні рэферэндуму чуў каля аўталаўкі (у нашай вёсцы магазіна няма, хоць тут двароў 80 будзе, хлеб прывозяць два разы на тыдзень):

— Чаму ж гэта так атрымліваецца, што ўсе непісьменныя за Лукашэнку, а пісьменныя, бачыш ты, усе супраць...

Пачнеш тлумачыць, абавязкова пакрыўдзяцца, што не падтрымліваеш іх думку, ды яшчэ са злосцю папракнуць:

— Бачыш ты, разумны знайшоўся...

І здзіўляешся: чалавек, які, апроч райцэнтра, нідзе не быў, ледзь чытае па складах, а каторы ўжо і літары забыўся, наадрэз адказваецца слухаць тлумачэнні чалавека з універсітэцкай адукацыяй, журналіста з саракагадовым стажам, які мае і жыццёвы, і такі-сякі палітычны вопыт, пабываў неаднойчы за мяжой і на свае вочы бачыў розніцу хвалёнага саўковага жыцця і жыцця людзей у “загніваючым” капіталізме.

Адно, што магчыма пачуць у адказ:

— Пазьняковец ты, а значыць, вораг наш...

Вось так. Ні больш ні менш. А гэта ўжо больш небяспечна, чым агульнавядомае “сам ты дурак”.

Першае, што, на маю думку, можа патлумачыць сутнасць вясковага электарату, гэта тое, што вёска, апроч некаторых знешніх атрыбутаў, ніколькі не змянілася. Успомнілася чамусьці аналогія: дзікая яблыня, выкапаная ў лесе, будзе дзічкай і на прысядзібным участку.

Вось гэтае параўнанне выклікала ланцуг новых аналогій...

Але напачатку нешта накшталт загадкі. Пазнайце чалавека, чым ён займаўся, адкуль родам, калі я не назаву яго прозвішча, цяперашнюю пасаду, а ўзгадаю толькі некаторыя ягоныя ўчынкі.

Ну, дык вось...

На адным аўтарытэтным пасяджэнні, якое перадавалі на ўсю краіну, гэты чалавек другому паважанаму чалавеку на нейкае ягонае апраўданне крыкнуў з пенай у роце: “Вон адсюль!”

Гэты чалавек, выступаючы прылюдна, неаднойчы зневажаў народных дэпутатаў, называючы іх “вшивыми блохами”, “дермократами”, “гнилой интеллигенцией”...

Гэты чалавек, маючы надзвычай высокую ўладу, загадаў нязгодных з ім народных дэпутатаў вывалакчы з залы пасяджэнняў на вуліцу і даць ім там як след...

Гэты чалавек сваіх былых калег абвінавачвае пры ўсім народзе каго ў 15 крымінальных грахах, каго ў крадзяжы дзяржаўных цвікоў, каго ў арганізацыі эмбарга ў рэспубліку баваўны... А пасля, калі ўсё гэта не пацвердзілася, ён не захацеў нават папрасіць прабачэння...

Гэты чалавек крычыць на ўсю краіну, што ён надзене наручнікі ўсім, хто яго не паслухаецца, пагражае нават тым, хто яшчэ і “не падумаў зрабіць” нешта кепскае...

Гэты чалавек пагардліва ставіцца як да народнага беларускага і сусветнавядомага пісьменніка, так і да сівога прафесара, лічыць сябе вялікім мовазнаўцам, хоць да філалогіі і не мае ніякага дачынення.

Калі сказаць, што такі чалавек мае дзве вышэйшыя адукацыі, то ў гэта цяжка паверыць.

Улічваючы хоць бы гэтыя факты, ці можна назваць гэтага чалавека выхаваным і культурным?

Ніяк нельга сказаць, што гэта дзяржаўны дзеяч. Нават малым дзецям вядома, што паводзіць сябе так нельга ні дома, ні на вуліцы.

Скажаце, што гэта чалавек з інтэлігентнай сям'і? Не, памыляецеся.

Гэта выхадзец з вёскі, гэта селянін, які ўвабраў у сябе ўсё, чым адметна была і ёсць наша вёска. Гэта тыповы выхаванец вёскі, які з матчыным малаком увабраў усё вясковае вулічнае, усё, што адбывалася і адбываецца на калгасным мехдвары, на фермах, сярод палядводаў, у вясковых кампаніях. Вы ж і самі добра ведаеце, што ў вёсцы не вельмі паважна ставяцца да такіх паняццяў, як культура, інтэлігентнасць. Тут, маю смеласць сцвярджаць, хутчэй за ўсё адбываецца нешта адваротнае. На вёсцы далёка не ўсе ў свой час паважалі і Кодэкс будаўніка камунізму, а зараз мала хто ведае, а тым больш прытрымліваецца божых запаведзяў. Тут свая, своеасаблівая культура паводзін, узаемаадносін, быту. Хоць слова “культура” тут не падыходзіць. Хутчэй — уклад, завядзёнка.

І калі наш прэзідэнт, не кантралюючы часам сябе і сваіх думак, махае кулакамі, абражае і пагражае, — тут, у вёсцы, яго прымаюць на “ўра!”: во дае; во малайчына; так ім і трэба; я б іх, гадаў, усіх бы да сценкі паставіў; гэтых дэмакратаў круціць у бараноў рог; гэты за нас, таму што і гаворыць так, як мы, і думае так, як мы...

А што не інтэлігентна выражаецца, што абражае, што палохае на кожным кроку ўсіх не згодных з ім, што загадвае амапаўцам збіваць на вуліцы людзей і хапаць іх у “варанкі”, выганяе з краіны “нячэсных” на яго думку дыпламатаў і журналістаў, то што тут такога? Як умее, так і правіць...

Тут, у вёсцы, людзі не задумваюцца над тым, што ўсё гэта не да твару прэзідэнту, што ва ўсім свеце прыняты іншыя нормы і правілы, што той свет жыве па іншых гуманных законах. І ў рэшце рэшт там чалавек даўным-даўно не думае пра кавалак хлеба ці каўбасы, як у нас. Там не думаюць пра тое, што прэзідэнт краіны — гэта нешта большае, чым старшыня калгаса ці дырэктар саўгаса. Там прэзідэнтаў паважаюць, а не баяцца. А ў нас прывыклі бачыць на чале краіны ўзурпатара, моцную руку, гаспадара, вялікага начальніка, якому ўсё дазволена. І калі, на іх думку, нешта не так, то паблажліва разважаюць: “Ён там на версе, мужыкі, яму там відней”.

Сяляне не могуць і не хочуць разумець тых норм і правілаў, тых гуманных законаў і культурных норм паводзін, што з'яўляюцца неад'емнай часткай жыцця цывілізаваных краін. Яны ўспрымаюць усё так, як заведзена спрадвеку ў вёсцы, асабліва ў савецкія часы. І калі, крый Божа, прэзідэнт дазволіць сабе ў эфіры ці ў газеце накрыць каго-небудзь нецэнзурнымі словамі, а прасцей кажучы, матам, сяляне будуць рукаплёскаць, хадзіць з хаты ў хату і пытацца: “Ці чуў, што "бацька" сказаў? Во малайчына! Так ім і трэба!”

Часам даводзіцца слухаць захапленні, што прэзідэнт выдатна ведае і валодае сялянскай аўдыторыяй, то тут, мне здаецца, асабліва здзіўляцца няма чаму. Ён вырас у гэтым асяродку. Ён такі, як і яны. Асаблівасць у тым, што ён выступае перад імі як старшыня калгаса, а сам электарат інтуітыўна надае тым словам адпаведную значнасць: гэта — гаспадар, кіраўнік краіны, надта вялікі начальнік, яго трэба слухацца і паважаць, а то, крый Божа...

Так ужо павялося спрадвеку, што селянін не можа абысціся без начальства, без нагляду. Яму трэба, каб ім кіравалі, панукалі, прымушалі, падказвалі, як і што рабіць. Сяляне ў асноўным не прымаюць свабоду, дэмакратыю, рэформы. Гэта для большасці з іх рэчы пакуль што недасягальныя.

Мне яшчэ з басаногага дзяцінства помніцца факт, пра які расказваў наш сусед, якому тады было год, можа, удвая больш, чым майму бацьку. Дык вось, дзед успамінаў, як з суседняй вёскі, з Дарагунска, што на Рагачоўшчыне, недзе перад самай першай сусветнай вайной мужыкі паслалі хадакоў да губернатара ў Магілёў, каб той праслаў ім пана, бо ранейшы памешчык з'ехаў за мяжу і ў наваколлі запахла духам свабоды. Прыслалі. Праўда, ненадоўга... Затое год праз пятнаццаць да сённяшняга дня паўсюдна заселі паны з мужыкоў, якіх зараз называюць “чырвонымі памешчыкамі”. І няма ніякіх праблем! Звыкліся, злюбіліся, вадой не разальеш...

А ці не адтуль, з тых далёкіх часоў, нягледзячы на Кастрычніцкую рэвалюцыю, якая павінна была мятлой вымесці ўсякіх паноў, цягнуцца жывыя ніткі і звязваюць той і наш час у адно-адзінае?

Адкуль, скажыце, у прыбліжаных да прэзідэнта асоб столькі фанабэрыстасці, барства, нахабнасці, грубасці?

Адкуль у вернападданых “вертыкальшчыкаў” замашкі глядзець у рот вышэйшаму начальству і хамства ў адносінах да тых, хто стаіць ніжэй за іх? І прагнасці прыхапіць як мага болей, пакуль ашываецца на службе ў вяльможнага пана?

Адкуль столькі непрафесіяналізму, верхаглядства, звычка бяздумна паўтараць за начальствам глупства, хлусню, абразы; з пакорлівасцю раба ўкараняць гэтае глупства ў жыццё?

Адкуль у начальства нізкі, часам нулявы ўзровень культуры? Адкуль у іх столькі душэўнай чэрствасці і чванства?

Адкуль у вясковых людзей задаволенасць мінімальнымі патрэбамі?

Адкуль не рабская, а нават жывёльная падпарадкаванасць усяму, што ідзе ад начальства, гаспадара, кіраўніка?

Адкуль такая нянавісць да інтэлігенцыі, разумных і адукаваных людзей?

Адкуль у простай часткі насельніцтва, асабліва ў сялян, ахвота верыць у хлусню, падтрымліваць пагрозы ў адрас прыстойных людзей, столькі злосці на тых, каго яны не разумеюць?

Адкуль?.. Адкуль?.. Адкуль?..

Шмат, вельмі шмат пытанняў, на якія не так проста даць вычарпальны адказ.

Вядома, што значная частка прычын хаваецца ў тым, што ўсё гэта — спадчына мінулага і неабавязкова толькі савецкага.

Мала хто ведае, але шмат каму не спадабаецца, што некалі занепакоены гэтай жа праблемай Максім Горкі ў гутарцы з Фёдарам Шаляпіным выказаў такую думку: усё, што ёсць наўкола нас кепскае, брыдкае, бруднае, ідзе з вёскі, ад мужыка.

Цёмны, забіты, з мінімальнымі бытавымі патрэбамі селянін як жыў, так і жыве сёння. І ён, гэты самы селянін, не толькі тут, у вёсцы, але і ў горадзе-сталіцы, абласных і раённых гарадах, у мястэчках, пасёлках гарадскога і вясковага тыпу.

Пасля вайны і да гэтага часу няспынна рознымі тэмпамі ідзе міграцыя з вёскі ў горад. І нясе яна, апроч усяго іншага, самую нізкую бытавую культуру, усчыненую на сквапнасці, нянавісці і мінімальных патрабаваннях у першую чаргу да сябе. Супольнасць колішняга вясковага жыцця змяняецца на адасобленасць, якая з'яўляецца найлепшай глебай для развіцця сурагатнай бытавой культуры і атмасферы ўвогуле. І паступова яны ператвараюцца ў дамінанту гарадской маскультуры. А зараз прыкіньце, колькі ў тым жа Мінску карэннага насельніцтва і колькі прыезджых. Недзе ў суадносінах 1:10. А калі яшчэ дадаць, што чалавек сапраўдным інтэлігентам становіцца недзе ў трэцім-чацвёртым пакаленні, то стане зразумелым, чаму ў горадзе часам нельга заўважыць прызнакаў інтэлігентнасці і культуры хоць бы на бытавым узроўні. Колькі я ў сваім жыцці прыкмячаў, што нават тыя, хто жыве ў горадзе аж з пасляваеннага часу (ад пісьменнікаў і журналістаў да высокапастаўленых чыноўнікаў і простага рабочага) запрошаныя ў госці ў інтэлігентную сям'ю, яны спачатку вядуць сябе вельмі прыстойна, як кажуць, далікатна, а дастаткова выпіць чарку-другую, як адразу невядома адкуль пачне вылазіць нявыхаванасць, адсутнасць інтэлігентнасці, хамства, брыдкаслоўе, амбіцыі накшталт: я — з вёскі, я — патомны селянін, я — з беднякоў, мае бацькі былі непісьменныя, а я скончыў інстытут, абараніў дысертацыю і г.д.

Искренне

Давайте покаемся, народ Беларуси!

В августе 1995 года в газете “Народная воля” под заголовком “Я начинаю покаяние народа Беларуси” было напечатано письмо Марии Петровны Яременко.

С тех пор минуло, считай, два года. В правильности избранного пути автор публикации ни разу не усомнилась, о чем и размышляет сегодня.

Всей душой уверовав в Господа Бога, Творца нашего, с восхищением восприняв премудрость Священного Писания, наполненного любовью и заботой о нас, Его чадах, изо всех сил попыталась понять причину бед нашего народа. Вследствие всего, получив благословение Господне на “извлечение драгоценного из ничтожного”, пришла к выводу, что белорусский народ является виновным в самом страшном непрощаемом грехе — хуле на Духа, так как в Беларуси богоборчество в послереволюционное время приняло самые крупные масштабы среди всех бывших союзных республик. И только полное отречение от зла, вызвавшего грех, может очистить народ, повернуть ход истории его на спасительный путь.

Фашизм и большевизм — два монстра 20-го века. Фашизм, уничтоживший чужие народы, низвергнут, и народ, породивший его, отрекся от него и процветает. Большевизм же, получивший смертельную рану в результате перестройки в нашей стране, исцелел и готов к реваншу. Читайте 13-ю главу Апокалипсиса.

Это наша Беларусь является эпицентром владений красного дракона. Это в нашу Церковь уже проник дьявол и смеялся 4 декабря 1996 года, шестикратно изображенный на митрах настоятеля храма и митрополита с помощью пластинок белых разной формы и величины по шести в горизонтальных и вертикальных рядах на фоне бордового и бирюзового бархата. Вот вам и загадочные три шестерки! Это наш народ помечается начертанием зверя, так как сброшенная по воле Божией коммунистическая символика, подхваченная нашим президентом и нацепленная снова на Беларусь, таковой и является.

Мне дороги и народ наш белорусский, и Церковь наша Православная. Нет мне милее ее. Все мои деды и прадеды были в одной вере — православной.

Я обращаюсь к вам, люди, а вы внемлите мне ради торжества истины, не требующей никаких жертв, а только любви к Богу и друг к другу. Если бы Церковь наша призвала нас к истинному покаянию еще до 1993 года, то не было бы тех ужасных кровавых событий. Слова Апостола Павла, как никогда, злободневно звучат сейчас: “Наконец, братия мои, укрепляйтесь Господом и могуществом силы Его, облекайтесь во всеоружие Божие, чтобы вам можно было стать против козней диавольских, потому что наша брань не против крови и плоти, но против начальств, против властей, против мироправителей тьмы века сего, против духов злобы поднебесных” (Кефес., 6, 10—12).

Нас пугают всевозможными врагами: какими-то загадочными масонами, НАТО, евреями, забывая, что Спаситель наш был послан изначально еврейскому народу, Матерь Божия — еврейка, в основании Нового Иерусалима будут записаны “имена двенадцати Апостолов Агнца” — тоже евреи: “...на воротах написаны имена двенадцати колен сынов Израилевых...” (Откр., 21, [illegible] 14).

Самый страшный и коварный враг — внутри нас. Истинное покаяние даст возможность Отцу нашему помогать нам, что до сих пор было невозможно. И если и есть у нас внешние враги, то только с Его помощью нам справиться можно будет и с ними. “Итак, оставляя времена неведения, Бог ныне повелевает людям всем повсюду покаяться...” (Дн., 17, 30).

Отступать же нам сейчас от истинного покаяния — совершить предательство, равноценное иудиному. Позволим ли мы еще раз допустить подобное?

Мария ЯРЕМЕНКО, православная

Народная Воля

11 ВЕРАСНЯ 1997 г.

Роздум

электарату, такія "затурканыя"

Але вернемся да нас, у вёску. Вёска, як і раней, жыве сваім жыццём. Жыве надзвычай марудна. Тая ж хата, той жа хлеў, той жа прысядзібны ўчастак, што застаўся ад бацькоў. Тыя ж адносіны, тая ж культура. Нават у тых, хто мае новую хату, машыну, дзве тэлевізійныя антэны або тэлеталерку.

І нават тыя, хто прыязджае з горада да бацькоў, мала чым адрозніваюцца. Хіба што вопраткай ды мовай, якая, на думку філолага, ёсць нешта сурагатнае: большасць слоў рускія, але вымаўляюцца па-беларуску. Мова такая ж, як у значнай частцы "вертыкальных" чыноўнікаў.

Але, калі пільна прыгледзецца, то галоўнай для селяніна сёння, ды, пэўна, і заўсёды была не палітыка, а ўласная гаспадарка.

Галоўны клопат, каб урадзіла бульба, не хварэла жывёла, несліся куры, даілася карова. Ды яшчэ каб назапасіць на зіму сена, саломы, дроў. Дзеля гэтага селянін падтрымае нават д'ябла, каб толькі не абрэзалі соткі па вуглы хаты, далі вазок-другі сена і саломы. Да ўласнага сала і бульбы на мізэрную пенсію ён яшчэ здольны купіць хлеба, макаронаў і якіх-небудзь круп. Зарплата ў калгасе вядома якая, да яе ўжо прызвычаіліся, але калі і зусім даваць не будуць, то і гэта перажывуць, бо некалі ж было і такое. І нішто, перажылі...

Вось у такіх умовах існуе сёння той электарат, які ў большасці сваёй пакуль што падтрымлівае прэзідэнта і ягоны рэжым, выступае супраць свабоды, дэмакратыі, рэформ.

Чым жа гэтак насалілі селяніну дэмакратыя і рэформы, якіх, дарэчы, яшчэ і не было, і свабода, якой селянін ні на смак, ні на пах не ведае?

Усе гэтыя найдаражэйшыя каштоўнасці не датычацца вёскі. Дык ці можа быць дэмакратыя і свабода злом для людзей? Здавалася б, трэба быць вар'ятам, каб супраціўіцца такой выгодзе, пасланай Богам. Парадокс? Так!

На мой погляд, усё ідзе ад звычайнага сялянскага кансерватызму, недасведчанасці, "затурканасці".

Рэдка ў каторай хаце няма тэлевізара. Нават радыёкропак менш, чым тэлевізараў. Каляровых два-тры на вёску, у асноўным — чорна-белыя. Антэны старыя, і ў некаторых хатах ідзе толькі Мінск. Газеты выпісваюць лічаныя двары. І то дзеля тэлепраграмы. Самыя папулярныя перадачы — тэлесерыялы і, вядома, выступленні прэзідэнта. А калі яшчэ больш шчыра сказаць, то шмат каму няма калі глядзець тэлевізар. То заняты на калгаснай працы, то дома па гаспадарцы, то няма калі з-за... п'янкі. Выпіўкі па розных прычынах — доўгачаканы дзень зарплаты, госці, свежаніна, пачатак або канец работ на прысядзібным участку, вяселлі і памінкі, кепскі настрой. Апасля — пахмелкі, якія часам цягнуцца днямі і днямі. А некаторыя з нашых аднавяскоўцаў не прасыхаюць гадамі.

Ну, скажыце, адкуль можа быць тая дасведчанасць? Нешта пачуў, часам не так зразумеў, расказаў другому каля аўталаўкі, а той дадаў свайго — глядзіш, на свет выплывае інфармацыя, але з дужа крывым тварам і становіцца праўдай-маткай.

А кансерватызмам вёска заўсёды вылучалася. Ну, навошта селяніну нейкія там змены? Пачнуцца змены — прыйдуць у вёску, давядзецца неяк прыстасоўвацца да іх, мяняцца самому і сям'і. А навошта? Можа, яшчэ і ненадоўга тыя змены, а потым дакажы новаму начальству, што ты не хацеў гэтага. Не, лепш няхай будзе так, як ёсць. Ды і ў цяперашніх умовах калі паспрабуеш што не так сказаць, то ў зручны момант могуць прыпомніць, тады бокам вылезе. Вось сказалі, што трэба галасаваць так, як жадае прэзідэнт. Ну, дык вазьму і прагаласую. І не праміну, каб суседзям пахваліцца, што начальству дагадзіў. Калі даведаецца пра тое начальства, то весялей у твой бок глядзець будзе. А там глядзіш — можа, і лішні воз сена дадуць, саломы ячнай брыгадзір дазволіць узяць, зямельку не на каменнях адвядзе пад бульбу. Ну, а калі начальства пераменіцца ці зменіцца вецер, то і тым падпяваць можна. Хіба ад гэтага з двара што знікне? Не. Ну, то і добра...

Вось такіх, хто гэтак думае і паводзіць сябе, у вёсцы большасць, амаль усе.

А цяпер давайце ўзгадаем, ці адна такая вёска ў Маладзечанскім раёне? А ў іншых раёнах? А па ўсёй Беларусі? А колькі людзей жыве ў гэтых вёсках?

Вось вам той сельскі электарат, які смела галасуе за Канстытуцыю, у якой ён нічога не разумее, якую нават у вочы не бачыў, якую не чытаў, а каторы і слова такога вымавіць не можа. Ён упэўнена галасуе за кандыдата ў дэпутаты, якога ніколі не чуў і не бачыў, а толькі таму, што так падказала начальства. Ён смела галасуе за тое, каб начальнікаў сабе не ён, селянін, выбіраў, а прызначала "вертыкаль", каб дзяржаўныя грошы былі не ў адных руках, падкантрольныя Вярхоўнаму Савету, а так, як захочацца прэзідэнту. А калі што-небудзь стане незразумелым, селянін можа смела падысці да таго ж начальства і тое падкажа, як трэба галасаваць, каго і што выкрасліць. А можа, калі няма часу, даць надрукаваную памятку, калі чытаць не развучыўся. Галасуй па дапаможніку! Не хочаш ісці галасаваць, да цябе дамоў прыедуць на машыне, і нікуды ты не дзенешся: прагаласуеш так, як "трэба".

І выніку, колькасць галасоў "за" ў рэшце рэшт нават пераваляць за жаданую рысу. А калі разабрацца, што каштуе той "голас"?

А як было б добра, каб галасы не падлічваліся, а ўзважваліся! Ну вось, напрыклад, пры рэферэндуме па Канстытуцыі. Пакладзіце на адну талерку вагаў голас адукаванага, навучанага кнігамі і практыкай юрыста (нават без вучонай ступені), і ён перацягне талерку, на якую пакладзены, скажам, галасы нашага Маладзечанскага сельскага электарату, а можа, нават вобласці. Ну, ці не так?

Той-сёй можа сказаць, што я згушчаю фарбы, што занадта ўжо рэзка выказваю свае думкі, што не ўсе там такія, як сказана. А ніхто і не сцвярджае, што ўсе. Але скажу цвёрда адно: большасць, абсалютная большасць. Хто не сляпы, той убачыць, хто разумны — зразумее; а хто з тае большасці, пра каго я пішу, то ім, як кажуць, пакуль што ўсё "да лямпачкі".

Кожнаму з нас вядома, колькі граматных, таленавітых, духоўна багатых людзей дала краіне і свету наша вёска. Гэта пісьменнікі і журналісты, вучоныя і царкоўныя дзеячы, медыкі, настаўнікі, інжынеры, будаўнікі, канструктары... Сярод іх нават выдатныя дзяржаўныя дзеячы ва ўладзе і апазіцыі.

А незадаволеным магу сказаць толькі адно: пішу я так гэтыя радкі не ад таго, што маю нейкую злосць на сялян, не ад непрыязні да іх. Жыву ж я сярод іх даўно, ёсць тут у мяне і сябры, і аднадумцы, і добрыя суседзі, і вяскоўцы, да якіх прыемна зайсці, пагаварыць па душах і адчуць, што яшчэ не ўсё згінула, што засталіся расточкі таго, дзеля чаго варта жыць і спадзявацца.

Мяркую, што мне, як і вам, хочацца, каб наша з вамі вёска нарэшце прачнулася, пачала жыць і развівацца, радавацца і перажываць за ўсё, што робіцца наўкола. Няхай тут жывецца шчасліва і радасна, у чысціні і парадку, няхай яна хутчэй набудзе прывабны і прыгожы твар.

Не зразумеюць мяне толькі тыя, хто любіць свой родны кут такім, як ён ёсць, хто хварэе на псеўдапатрыятызм, хто не жыве, а бывае ў вёсцы наездамі, хто далей калгаснай канторы вачэй не паказваў і, вядома, той, хто любіць заказныя рэпартажы "чэсных" журналістаў пра тое, што наша вёска на ўздыме, нягледзячы на часовыя цяжкасці. Такім хочацца адказаць рэзка і рашуча: не часовыя гэта цяжкасці. Гэта катэгорыя ў адносінах да вёскі **пастаянная.** І ніякага ўздыму няма. **Ёсць заняпад!** Ёсць хлусня, ёсць жывучае жаданне ў некаторай часткі людзей па-ранейшаму выдаваць уяўнае за рэчаіснасць!

Не зразумеюць мяне і тыя, хто лічыць, што раней мы былі багатымі, шчаслівымі, быў парадак, дысцыпліна, было куды і каму паскардзіцца. Тады і цяпер ёсць вялікая колькасць людзей, якія не могуць дазволіць сабе самага простага: параўнаць той наш "шчаслівы" час з тым жа часам на Захадзе. Як нас варта было тады шкадаваць за нашу беднасць, не кажучы ўжо аб сённяшнім дні.

А калі не могуць яны дазволіць сабе такога параўнання, то, вядома, не могуць задумацца і над такімі фактамі.

Чаму мы, працуючы не лянуючыся, атрымлівалі за сваю працу ў сто разоў меней, чым там?

Чаму мы, зарабляючы ў сто разоў меней, купляем прадукты і ўсё неабходнае амаль па сусветных цэнах?

Чаму там фермер выбракоўвае карову як непрадуктыўную, якая дае 6—7 тысяч літраў малака, а ў нас фермы, дзе надойваюць ад каровы па чатыры тысячы літраў малака за год, лічацца перадавымі ў краіне? А ёсць жа такія калгасы, дзе надойваюць менш за 1,5 тысячы літраў. Мая каза дае амаль удвая больш!

Чаму там, у такой вёсцы, як наша, ёсць два-тры магазіны, адно-два кафэ, а да нас прыязджае аўталаўка два разы на тыдзень?

Чаму там бастуюць, патрабуючы надбаўкі да і так высокай зарплаты, а ў нас людзі, якім па тры-чатыры месяцы не выдаюць у сто разоў меншую зарплату, часам тыднямі не прывозяць у вёску хлеб, баяцца нават слова сказаць у адрас тых, хто ў гэтым вінаваты?

Чаму там не сціхаюць дэманстрацыі пратэсту супраць забруджвання навакольнага асяроддзя, а ў нас летась вясной трактары, вывозячы гной з фермы, забрудзілі вуліцу караваком аж па калена, а ніхто не сказаў нават слова пратэсту?

Божанька-Божа! Колькі яшчэ кожнаму з нас самому сабе і ўсім нам можна задаць падобных пытанняў, на якія большасць з нас не хоча адказаць, баіцца адказаць?!

Колькі ж трэба было церці нас і мяць, каб вылепіць нешта такое, што нагадвае жывёліну, — маўклівую, цярплівую, пакорлівую?

І вельмі маркотна робіцца, калі ловіш сябе на думцы, што з такімі людзьмі, запалоханымі, затурканымі, замбіраванымі на адпаведны лад, мы ніколі не пабудуем прыстойнага жыцця на вёсцы. Гэтак жа будзем хадзіць "да ветру" за хлеў і праз сто год, гэтак жа будзем дзякаваць уладзе за тое, што калі-нікалі ў вёску прывязуць хлеб, мыцца дома ў начоўках, тапіць грубкі і печы, часацца, ратуючыся ад вошай, ездзіць па дарогах, усеяных калдобінамі, хадзіць круглы год у гумавых ботах, месячы мокры снег і гразь, і... піць, піць самагонку, "барматуху", "чарніла" і ўсё астатняе, "што гарыць". Піць ад школьных гадоў да скону, загадзя ведаючы, што не паспееш ты астыць, як за ўпакой тваёй душы мужыкі і бабы апарожняць не адзін трохлітровы слоік самагонкі... З чым сустракаюць цябе на гэтым свеце, з тым і праводзяць на твой прыватны надзел зямлі ў памеры двух квадратных метраў. Стагоддзямі так было і, пэўна, так яно і будзе да скону свету...

Сумна, праўда? Вельмі сумна!

Як пяецца ў знаёмай песні: "а напоследок я скажу..." Скажу шчыра, не баючыся, што зноў буду кім-небудзь абляяны. Ды і не мая гэта мэта — спадабацца каму-небудзь. Не тыя гады...

Цяпер усе шукаюць выйсця з крызісу, з часовых цяжкасцяў, з нястачы, з тупіка. А мне хочацца спытаць: а вы не помніце, як заходзілі? Маглі б, як тая Арыядна, прывязаць пры ўваходзе якую-небудзь нітку. І тады б стала зразумела, адкуль трэба пачынаць зноў і з чым ісці ў дарогу.

Мне расказвалі, як адзін вельмі вядомы кампазітар, спяшаючыся на творчую сустрэчу, хуценька сабраўся і выскачыў з дому ў паліто (гэта было зімой), але ў адных... сподніках.

Не адзін раз было сказана: нельга куды б там ні было ісці толькі ў адной ватоўцы, без штаноў. Абавязкова трэба ісці ў дарогу, адпаведна апрануўшыся. Я ўспамінаю пра гэта кожны раз, калі напярэдадні ўсякіх рэферэндумаў і выбараў выцягваю з паштовай скрынкі агіткі, праграмы, заклікі. Як правіла, кожны кандыдат, каб спадабацца выбаршчыкам, вылучае на першае месца эканамічныя пытанні. Прынята думаць да гэтага часу, што эканоміка, а дакладней, танная, двухрублёвая каўбаса, выцягне нас з крызісу і пацягне за сабой актывізацыю ўсяго астатняга, у тым ліку і культуру. Дазволю сабе ў адказ не надта культурнае слова: лухта!

А выказаўся я так недалікатна таму, што і я, як большасць з вас, чытачоў, інтэлігент з вялікай нацяжкай. Калі можна так сказаць, інтэлігент у першым пакаленні, выхадзец з вёскі, праўда, не яе выхаванец.

Тыя аргументы, якія я буду прыводзіць, не новыя. Яны ў свой час гучалі з высокіх трыбун, друкаваліся ў газетах і часопісах, пра іх напісана ў разумных кніжках. Але яны да гэтага часу не запатрабаваныя нашымі ўладамі. Культура не стала, так бы мовіць, дзяржаўнай дактрынай. Так, недзе на апошнім месцы пасля спорту.

Чаму ж культура ў шырокім сэнсе гэтага паняцця стала непатрэбнай нашаму грамадству, нашай дзяржаве? Чаму двухрублёвая каўбаса, кавалак хлеба, бутэлька малака і асабліва "малака ад звар'яцелай каровы" стаяцца ў горадзе і асабліва на вёсцы на самае першае месца, адмятаючы ўсё астатняе як непатрэбнае?

Вядома, што шырокае паняцце культуры даецца нам пры нараджэнні толькі ў выглядзе зярнят. І ўсё залежыць ад таго, у якую глебу яны лягуць, якія дадуць усходы і якое пустазелле вырасце побач. Ці здолеем мы альбо замарудзіць рост гэтай "дзікай травы", альбо зусім яе вырваць, — гэта залежыць ад нас саміх і ад ахвоты і зацікаўленасці ўлады ў асобе выхаваных на лепшых узорах чалавечых якасцяў дзяржаўных мужоў. Агульнавядома, што бескультурнага чалавека часта параўноўваюць з пустым коласам...

Чамусьці мала каго з уладных структур турбуе, што большасць насельніцтва так і не змагла далучыцца да агульначалавечай культуры, пазбавіцца ад шматлікіх заганаў, захоўваючы ў сабе якасці раба, баязліўца, прыстасаванца, падхаліма, двурушніка.

Мяне часам наведвае жудасная думка: мусіць, праўда, што ўладзе і дзяржаве наогул выгадна такое становішча. Такі народ можна лёгка падпарадкоўваць, можна віць з яго вяроўкі. Ён, як і сёння, будзе ціха сядзець "пад венікам", нават не ўяўляючы сабе, што жыццё яго ідзе і пройдзе ў здзеках і нястачы, у грахах і дзеяннях, не прыстойных чалавеку. Селянін ці то баіцца задумацца, ці то не хоча дадумацца, што ідзе і праходзіць гэтае жыццё так кепска не таму, што ў яго такі лёс, што Бог так хоча, а таму, што ён сваімі паводзінамі сам сябе паставіў у такое становішча і пагэтаму стаў такім затурканым, забітым, запалоханым і не здольным думаць сваёй галавой. Ён, загіпнатызаваны, робіць тое, што ў звычайных умовах нармальны чалавек і ў думках не дазволіў бы сабе.

Што ж гэта, братка-беларус, з табою робіцца? Што ж ты спіш, як у зачараваным сне? Што ж будзе з табой, з усімі намі, калі годнасць сваю чалавечую станем мы мяняць на ахапак ячнай саломы ці воз мурагу? Што ж мы баімся **паказаць** сваю чалавечую годнасць, а толькі расказваем пра яе, чаму ўжо мала хто верыць?

Годнасць тады годнасць, калі ты з высокападнятай галавой, валодаючы смеласцю і дадзеным прыродай табе розумам, можаш адкрыта сказаць "так" або "не" і з дастатковай рашучасцю будзеш адстойваць сваю пазіцыю, не аглядаючыся па баках!

Насіць жа торбу за плячыма і хваліцца ўсім, што ў цябе былі смелыя і адважныя продкі, як робяць зараз некаторыя, шмат мудрасці не трэба. Мудрасць заключаецца ў тым, каб самім стаць такімі, як нашы славутыя землякі-папярэднікі, працягваць іх справу, перадаваць з самага маленства сапраўдную годнасць сваім дзеткам.

Прачынайся, братка-беларус! Досвітак на двары. Дарога табе наканавана цяжкая — да ісціны і годнасці шлях нялёгкі.

У дарогу, браце!

в.Мазалі.

Маладзечанскі раён.

Стоп-кадр



Мараканскі форт.

НТВ шагает по Израилю

Несколько месяцев назад часть кабельных компаний начала экспериментальный показ передач телеканала НТВ в некоторых районах Израиля. По словам Трайбера, в ходе эксперимента были проведены опросы, результаты которых свидетельствуют о высоком качестве телепередач на этом канале, а также о том, что большой процент телезрителей в районах экспериментальной трансляции предпочитает этот канал всем остальным. "На основании результатов этих опросов решено транслировать НТВ во всех районах Израиля", — сказал Густаво Трайбер.

Российский телеканал НТВ наконец вырвался из отдельно взятых городов на широкие просторы Израиля. Это стало возможным благодаря сотрудничеству НТВ с руководителями компаний кабельного телевидения в Израиле. Начало вещания НТВ на весь Израиль было замечено не только русскоязычной аудиторией, но и израильскими средствами массовой информации. Газета "Маарив" опубликовала подробный рассказ о новом канале.

Начало широкой трансляции НТВ в Израиле было отмечено пышной презентацией, которая состоялась в Рамат-Авиве, в музее Эрец Исраэль. На приеме присутствовали министры, депутаты кнессета, журналисты и общественные деятели. Торжественный вечер был организован руководителем рекламной фирмы "Тотал промоушн" Жанной Тверской по поручению Ассоциации кабельных телекомпаний и представительства НТВ в Израиле.

Чем больше Е, тем дальше старость

Витамин Е действительно может отсрочить или предупредить физическое старение — первые биологические подтверждения этому получили американские ученые, проводящие опыты на лабораторных мышах. Специалисты из Аризонского университета продемонстрировали, что большие дозы витамина Е могут поддерживать функции головного мозга и иммунной системы у старых мышей. По мнению ученых, дневная доза витамина Е не должна превышать 800 миллиграммов. Они отмечают, что для изучения воздействия витамина Е на организм человека необходимы дальнейшие исследования.

Стукачи с метлой

Многие подшучивают над дворниками и мусорщиками, кое-кто попросту старается не замечать их, и вообще люди проявляют к ним мало уважения. Но в некоторых районах США мусорщики играют особую роль в деле обеспечения безопасности. В штате Колорадо еще в 1990 году одна компания по уборке мусора организовала группу содействия полиции. Во время работы они тщательно просматривают улицы, и если что-либо вызывает у них подозрение, сообщают диспетчерам, которые затем вызывают полицию. Теперь такие же группы работают в городах штатов Массачусетс, Юта и Техас.

"Шалом-ТВ" на всю Европу. На европейских языках

В 1998 году в Европе начнет действовать израильский телеканал "Шалом-ТВ". Его программы на иврите, английском и французском языках будут транслироваться по каналам спутникового телевидения практически на весь европейский континент. Есть предложение об отдельных передачах на русском языке.

Создатели канала надеются, что среди абонентов "Шалом-ТВ" будут не только живущие за рубежом израильтяне и члены еврейских общин, но и все те, кто интересуется еврейской культурой.

Италия



Архитектурный фрагмент.

Фото Николая АЛЕКСАНДРОВА.

Что сделаешь, если полякам не нравится коммунистическое прошлое

Газета "Шверинер Хандельсблатт" напечатала материалы, посвященные развитию культурно-политических отношений между Россией и Польшей. Газета сообщает, что в российско-польских отношениях продолжает развиваться напряженность, возникшая из-за полного отрицания поляками всех культурных и исторических ценностей, которые каким-либо образом напоминают о годах коммунистического правления. Газета также сообщает, что вслед за перезахоронением братских могил советских воинов под Краковом польские власти теперь намерены переделать обелиск красноармейцам в городе Познань. По данным газеты, с обелиска должны исчезнуть все коммунистические атрибуты, и в первую очередь знамена и красные пятиконечные звезды. Газета отмечает, что вице-консул российского посольства в Польше Сергей Семенов уже подал польским властям ноту протеста и заявил о намерении Москвы всеми способами добиваться сохранения монумента советским воинам в первозданном виде. По мнению газеты, столь частые трения между Россией и Польшей по поводу общего коммунистического прошлого не способствуют развитию добрососедских отношений и могут послужить поводом к дальнейшему росту напряженности между двумя странами.

Сирия недовольна Израилем

Израиль, Турция и США проведут совместные военно-морские маневры в восточном Средиземноморье в ноябре, сообщает "Рейтер". Будут отрабатываться операции поиска и спасения в международных водах. Следует отметить, что Израиль впервые проводит учения с мусульманской страной. Информация о маневрах вызвала резкую критику арабских стран, особенно Сирии. Она, как известно, находится в состоянии войны с Израилем и имеет серьезные разногласия с Турцией.

Дайджест

Тайвань открывает новую эру с Пекином

Президент Тайваня Ли Дэнхуэй выступил с предложением приехать в Китай и встретиться с его лидерами, сообщает "Рейтер". "Я хочу встретиться с китайским руководством, чтобы обменяться мнениями и открыть новую эру в наших отношениях", — заявил президент на семинаре в Тайбэе, посвященном политическим проблемам стран Тихоокеанского региона. Как известно, Китай с 1949 года считает Тайвань своей отколовшейся провинцией и настаивает на воссоединении. Китайское руководство считает, что оно произойдет в начале следующего века. В то же время в самом Тайване преобладает стремление к провозглашению государственной независимости. В 1996 году Китай и Тайвань оказались на грани войны, поскольку китайское руководство пыталось повлиять на ход президентских выборов на острове, проводя пуски ракет в районах, прилегающих к побережью Тайваня.

Клонирование — это безнравственно и неэтично по отношению к будущим поколениям

Европейская комиссия по правам человека высказалась за полное запрещение клонирования на территории Европы, сообщает агентство ДПА. Комиссия подтвердила ранее принятую резолюцию Европейского парламента, которая содержала такое же решение. Агентство отмечает, что комиссия рекомендовала ученым не только прекратить все опыты по клонированию, но и впредь воздержаться от каких бы то ни было опытов по генному воспроизведению клеток живых существ. Агентство также сообщает, что комиссия по правам человека обосновала свое решение большим количеством заключений экспертов о том, что подобные опыты безнравственны и неэтичны по отношению к будущим поколениям людей.

Вот это компания — купит сразу 115 самолетов

Компания "Интернэшнл Лиз Файнэнс" намерена заказать 115 самолетов у фирм "Эрбас Индастри" и "Боинг" на сумму порядка 7 миллиардов долларов, сообщает "Уолл-Стрит Джорнел". О заказе официально будет объявлено на этой неделе. По данным газеты, "Эрбас" получит заказ на 65 лайнеров, включая 15 самолетов А-330-200 и около 50 А-320. Таким образом, "Интернэшнл Лиз Файнэнс" становится крупнейшим заказчиком "Эрбас Индастри". Детали соглашения с "Боингом" пока неизвестны.

Жить и работать или жить и не работать?

